# З гісторыі Ельшчыны

## Ян Налепка

*2* мая 1945 года, у дзень, калі савецкія воіны ўзнялі перамаганосны чырвоны сцяг над павержаным Берлінам, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў Яну Налепку званне Героя Савецкага Саюза. Ён першы са славакаў быў удастоены гэтай высокай узнагароды за асаблівыя заслугі ў развіцці партызанскага руху. Сваім актыўным удзелам у баях супраць фашысцкіх захопнікаў разам з савецкімі партызанамі, сваім гераізмам, грамадзянскай мужнасцю і, нарэшце, сваёй крывёю, пралітай у гэтай агульнай барацьбе, Ян Налепка назаўсёды змаішваў вузы дружбы і брацтва народаў Чэхаславакіі і Савецкага Саюза. Адна з вуліц горада Ельска носіць імя Героя Савецкага Саюза, Нацыянальнага Героя Чэхаславакіі Яна Налепкі. Памяць аб гэтым бясстрашным сыне чэхаславацкага народа асабліва дарагая жыхарам Ельшчыны. на тэрыторыі якой ён прайшоў нялёгкі шлях ваенных выпрабаванняў.

Нарадзіўся Ян Налепка ў сяле Сміжаны пад Высокімі Татрамі ў 1912 годзе ў сям'і селяніна-бедняка. Да вайны ён настаўнічаў. Затым служба ў арміі. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Ян Налепка са сваім славацкім палком аказаўся на савецкай тэрыторыі. Летам 1942 года на Палессі Ян Налепка аб'ядноўвае вакол сябе аднадумцаў, устанаўлівае сувязь з кіраўнікамі злучэння партызанскіх атрадаў Мінскай і Палескай абласцей і, рызыкуючы жыцццём, выконвае важныя заданні. У гэты час была ажыццёўлена буйная аперацыя па ўзрыву чыгуначнага места на рацэ Пціч,

Ян і яго сябры ўстанаўліваюць цесныя кантакты з белв'рускімі партызанамі. Патрыеты-Інтэрнацыяналісты передавалі ім звесткі аб прадстаячых апе-рацыях гітлераўскага каманда-вання, дапамагалі мініраваць да рогі і тнасты, забяспечвалі пар-тызан боепрыпасамі і медыка-ментамі. Восенню 1942 года славацкі 101 полк быў перакі-нуты ў Ельскі раён. І тут Ян Налепка 1 яго сябры хутка на-ладжваюць сувязь з мясцовым падполлем. з кіраўніцтвам Ель-скай 37-й партызанскай брыга-ды. 14 мая 1943 грда Ян На-лепка з групай славакаў вын-шаў з горада і прыбыў да пар-тызан. Адбылася яго сустрэча з камандзірам партызанскага злучэння генерал-маёрам Сабу-равым А. М. У вёсцы

Чапаеў-ка адбыўся мітынг партызан І мясцовых жыхароў, прысвеча-ны пераходу славакаў на чале з Янам Налепкам   да партызан.

3 яркай антыфашысцкай прамо-вай выступіў Ян Налепка. Ад імя сваіх таварышаў ён даў клятву на вернасць чэхаславан каму і савецкаму народу ў і\ барацьбе супраць фашызму. А лраз некалькі дзён быў сфар-міраваны атрад пад каманда-ваннем Яна, які ўвайшоў у са-стаў сабураўскага злучэння.

У барацьбе супраць захопні-каў нямала баявых подзвігаў здзейснілі слаўныя сыны чэха-славацкага народа, На рахунчу атрада - бой 3 карнікамі ў раёне в. Данілевічы, удзел у разгроме Ельскага і Мазырска^ га гарнізонаў, шматлікія баі на тэрыторыі Жытомірскай і Ро-венскай абласцей.

Варта падкрэсліць. што Ян быў прынцыповы, таленавіты, працалюбівы чалавек. Як толь-кі стаў на шлях працоўнай дзейнасці, адразу ж'набыўсім-патыю і падтрымку таварышаў. Дзякуючы гэтым абставінам і свайму славалюбству ён пасля заканчэння ліцэя паступіў у Дзяржаўны настаўніцкі інсты-тут у С'пішнай Новай Всі. Там пачаў больш глыбока займацца вывучэннем  класічных творау

чэшскай літаратуры, такіх пісь-меннікаў як Іраска Неруда і інш. Дзякуючы вывучэнню іх твораў ён пачынае бліжэй зна-бміцца з чэшскім народам,

пачалі фарміравацца яго ідэі аб брацкіх адносінах паміж чэ-хамі і славакамі, адзінай кра-іны, якія паступова перарасталі ў ідэю славянскай агульнасці. У 1931 годзе пасля заканчэння інстытута Ян Налепка працуе настаўнікам у горнай вёсцы Марылава непадалёку ад Пі-вашскай Быстрыцы. Пры развi-танні з моладдзю Сміжан он напісаў тады: «Мы, маладыя і бедныя людзі, павінны ваяваць за кавалак хлеба, лёс неміласэр на кідае нас з аднаго месца ў другое. Мяне таксама лёс адар-ваў ад вас,.: Дле я епадзяюся супрацьстаяць цяжкасцям', якія сустрэнуцца на вашым шляху ў Снішы. Не дапускайце свайго заняволення дэмагогамі і фра-зёрамі».

Перадавыя перакананні Яна Налепкі ясна працягвалі праяў-ляцца і на трэцім месцы рабо-ты ў Ступаве, дзе ён працаваў у якасці настаўніка пасля ка-роткага знаходжання ў Біелых Водах у 1934 годзе. У Ступаве вакол Налепкі пачынае згуртоў вацца рабочая моладзь і вяскб-вая бедната, сярод якой ён ня-мала здзейсніў у галіне асветы і выхавання самасвядомасці мас. Ён прыцягнуў на свой бок мно-га маладых людзей пры пад-трымцы мясцовага рабочага фіз

культурнага аб'яднання, веў растлумачальную работу, тлума-
чыў, чаму існуе сацыяльная не-справядлівасць, чаму

неабходна ахоўваць недатыкальнасць сва-ёй рэспублікі як ад замежнага, так і ад унутранага фашызму. Кн пераконваў масы ў тым, што лёс рэспублікі нельга даверыць, робячы ўступкі, фашыстам, што трэба імкнуцца перш за ўсё па-глыбляць супрацоўніцтва з Са-вецкім Саюзам. Само сабой зра-зумела. што сваімі выступлен-нямі ён выклікаў незадаволе-насць з боку дырэкцыі школы, у якой знаходзіліся прадстаЎ-нікі славацкага клерьшальна-фашысцкага рэжыму. ПагэтэМу ў 1938 годзе ён пакідае сваё месца настэўніка Ў Ступаве,

Палітычнае перакананне Янч Налепкі асаблівв паглыбляец-ца у крытычным 1938 годзе, калі ён пераканаўся ў тым. што камуністы з'яўляюцца адзінай арганізацыйнай сілай, якая ад-вергла капітуляцыю 1 перадачу ўлады ў рукі славацкіх фашы-стаў. Бескампрамісныя адносі-ны да славацкіх фашыстаў І ўпаўне склаўшыйся светапогляд, штб датычыцца пытання Чэха-славацкай рэспублікі, прывялі яго гіаступова да ўдзелу ў ра-боце падпольнай камуністычнай партыі. Выражэннем свайго поў нага атаесамлення з намаганнямі і мэтамі

падпольнай камуністыч най партыі з'явілася таксама яго знаходжз"Ч<> $ арміі фашы-

сцкай «славацкай дзяржавы». куды ён быў мабіліз&ваны V 1939 годзе.

Хутка пасля нападу гітлераў-скіх полчышчаў на Савецкі Са-ю? фашысцкі ўрад «свяшчэн-най рэспублікі» накіроўвае свае дывізіі на Усходні фронт, кіда-ючы іх на братазабойную вай-ну. Разам з тысячамі іншых салдат, Ян Налепка ў якасці канітана штаба так званай пры крываючай дывізіі трапляе ў Савецкі Саюз, які ён так лю-61 ў і так захапляўся. Мэтай гэтай дывізіі было ў Жытомір-скай і Палескай абласцях у ты-ле гітлераўскіх войск ахоўваць ад партызан у першую 'чаргу камунікацыі. Надраздзяленні ды візіі былі размешчаны ў многі* украінскіх гарадах і в#ска.х,ціто дазваляла славацкім салдатам мець зносіны з іх жыхарамі. Вольшасць з іх уласнымі ва-чыма бачылі зверствы. якія чынілі нацысты над мірным на-сельніцтвам. Гэта жорсткая рэ-чаіснасць адыграла рашаючую ролю ў абуджэнні свядомасці сярод славацкіх салдат, пад-рыхтавала глебу для зараджэн-ня і фарміравання антыфашысц кага супраціўлення ў арміі. І, канешне ж, першы, хіго належаў да членаў гэтага /супраціўлення :і перадавымі дэмакратычнымі 1 рэвалюцыйнымі поглядамі, быў Ян Налепка. Паст.упоВа 6н стаў адным з кіраўнікоў падпольна-га руху сярод сал'дат і афіца-раў у славацкай арміі. Разам еа сваімі сябрамі ён прыкладаў

намаганн). да таго, каб папяр:»-дзіць брптяябойнае крона'фя

ліцце. Экспедыцыі карнікаў, якія накіроўваліся супраць жы-хароў

партызанскіх сёл, садзей-нічалі таму, што Ян Налепка і яго таварышы па зброі пачалі аказваць дапамогу мясцовым жыхарам, забяспечваючы 1х ме-дыкаментамі, харчаваннем і вупражжу. Апрача таго, Ян На-лепка збіраў важную ваенную інфармацыюі аб нацысцкіх пад-раздзяленнях. Іх дзеяннях, пад рыхтоўваемых супраць парты-зан, а таксама ўстанавіў су-вязь з генералам Аляксандрам Мікалаевічам Сабуравым — ка мандзірам аб'яднаных партызан скіх атрадаў у Жытомірскай вобласці. Ён пастаянна падрых-тоўваў пераход як моялна боль-шай колькасці славацкіх сал-дат і афіцэраў на савецкі (юк, Падпольную супрацьфашысцкую дзейнасць у радах арміі ён ввў пад клічкай Рэпкін. Ян Налеп-ка перайшоў з групай сваіх іаварышаў па зброі да парты-зан і змагаўся разам з часцямі генерала Сабурава. Вось што піша па гэтаму поваду генерал-лейтэнант у адстаўцы Марцін Корбель: «У 101 славацкі полк, які ў гады вайны знаходзіўся ў Ельску І ахоўваў чыгуначныя лініі. масты 1 іншыя аб'екты, Марціна Корбеля прыслалі ў пачатку 1943 года. Назначылі вадзіцелем танка. Як многія ін-шыя славацкія салдаты і афі-цэры, гвалтоўна загнаныя ў фашысцкую армію, Корбель чацеў перайсці да савецкіх пар-тызан.

# На^альнікам штаба пал-ка ў той час быў каэпітан Ян Налепка, чалавек п працоўнай

сям'і, былы народны настаўнік Ян ненавідзеў фашызм. Яшчэ ў 1942 іодзе, знаходзячыся ў гар нізоне пасСлка Капцэвічы. што ў Петрыкаўскім раёне, Налепка ўстанавіў сувязь з палескімі партызанамі. аказваў ім самую разнастайную дапамогу. У маі 1943 года разам з групай тава-рышаў Налепка адкрыта перай-шоў на савецкі бок, арганіза-ваў партызанскі атрад. які дзей нічаў у лясах Беларусі 1 Украі-ны>.

Пераход Яна Налепкі да пар-тызан выклікаў трывогу ў фа-шысцкага камандавання. У Ельск неадкладйа былі накіра-ваны гітлераўскія часці, каб раззброіць славацкі полк. Калі гэта акцыя не прайшла. тады быў выдадзен загад аб смярот-най кары для тых, хто ўходаіў да г-артызач, І рэпрэсіях да іх сем'яў і блізкіх. Многія салда-ты. баючыся за свае сем'і, .ад-клалі пераход. Але не змяніў рашзння Марцін Корбель. 8 чэрвеня ён угнаў танк. Прасле-дуемы фашыстамі, Марцін даб-раўся з Ельска да вёскі Рамя-зы. На шляху не мог пераадо-лець забалочанае месца ля пра-цякаўшай ля Рамязоў рэчкі і танк загруз. Мясцовае насель-ніцтва дапамагло Марціну су-стрэцца з партызанамі. 3 дапа-могай апошніх і жыхароў вёскі імкнуліся выцягнуць танк. Да-рэчы. на яго фашысты зрабілі самалётамі. Тады Мар-цін зняў з баявой машыны ку-лямёт **1** адзін фашысцкі сама-лет пашкодзіў. Пасля паветра-най дуалі Корбеля дяставілі ў штаб партызанскага злучэння. Сустрэўся ён з генералам Сабу-равым і капітанам Налепкай. Стаўшы партызанам 1-га чэха-славацкага атрада. удзельнічаў у многіх баях, у тым ліку 1 за горад Оўруч.

Як вядома, Ян Налепка 15 мая на кані разам з групай сваіх таварышау прыбыў у в. Рамязы.

Па загаду генерала Сабурава ад 18 мая 1943 года са славацкіх салдат быў сфар-міраван першы чэхаславацкі са-мастойны партызанскі атрад у СССР, камандзірам якога стаў Ян Налепка-Рэпкін. Славацкія салдаты, натхнёныя гэтым пры кладам, папаўнялі рады парты-занскага атрада. Да канца 1943 года на савецкі бок перайшло звыш 2 тысяч славацкіх салдат і афіцэраў. Славацкія парты-заны| якія састаўлялі значную частку падраздзялення парты-зан Сабурава. не раз вызначалі ся ў баявых дзеяннях па зні-шчэнню камунікацый праціўні-ка.

Савецкае камандаванне высо-

ка ацаніла ўдзел атрада Яна Налепкі ў баях супраць фашысц кіх захопнікаў 1 з выпадку вы-звалення г. Кіева, дзе ён так-сама прымаў удзел. Многа сал-дат чэхаславацкага партызанска га атрада было ўзнагароджана савецкімі ордэнамі. Капітан Ян Налепка быу выдатным парты-занскім камандзірам, што не-аднаразова даказваў пры выка-нанні розных баявых задач, у дыверсійных работах, у развед-цы і г. д. Пры наступе нашых войск наяосіўся галоўны ўдар

на важны стратэгічны і чыгу-начны вузел Оўруч. Як стала вядома, фашысты хацелі поўна-сцю знішчыць гэты вузел. Вось чаму неабходна было прадпры-няць усё, каб не дапусціць вы-канання гэтай задумы ворага. Важная задача была даручана партызанскаму злучэнню Сабу-рава. а значыць. і салдатам Яна Налепкі. Пасля таго, як быў узят з боем важны мост непадалёку ад горада Оўруча, партызанскі атрад працягваў рэалізацыю свайго баявога за-дання: прадстаяла ў што б там ні было ўзяць чыгуначную стан цыю. Пры яе штурме Ян На-лепка быў смяртэльна паране-ны. Па ўспамінах сяброў па зброі, 6н прыпадняўся і скаман даваў: «Наперад, таварышы! Бейце ворага...» Адданы сын Чэхаславакіі, шчыры сябар са-вецкага народа загінуў у жорст кім баі 16 лістапада 1943 года. Яго пахавалі разам з баявымі сябрамі ў Оўруцкім парку. Ка-пітан Ян Налепка з'яўляецца Героем Савецкага Саюза, На-цыянальным Героем Чэхаслава-кіі. Ен аддаў сваё маладое жыц це ў барацьбе супраць фашыз-му, за свабоду і шчасце буду-чых пакаленняў.

**П. АКУНЕЦ, галоўны захавальнік музейнага**